ЦІКАВОСТКІ

# СВЕТ ЗАХАПЛЕННЯЎ

***Жыццё будзе яшчэ больш цікавым, калі знайсці сабе занятак для душы. У гэтым упэўнены выкладчыкі і супрацоўнікі нашага ўніверсітэта, якія з задавальненнем бавяць час за любімым хобі. Якім? Ва ўсіх яно рознае: калекцыяніраванне, раслінаводства, фатаграфаванне, хэнд-мэйд і інш. Сёння мае суразмоўцы – старшы выкладчык кафедры крымінальнага права і крымінальнага працэсу Віялета КАЗЛОЎСКАЯ і выкладчык-стажор кафедры дызайну Анастасія ВАРГАН. Віялета Віктараўна захапляецца фатаграфаваннем, а Анастасія Андрэеўна – вырабамі з дрэва.***



***– Віялета Віктараўна, як вы праводзіце вольны час?***

– Часцей дома, з сям'ёй ці з кніжкай у абдымку. Магу паглядзець кіно, люблю прагулкі па старым Віцебску, аўтамабільныя падарожжы па гарадах і вёсках. Удваіх з мужам мы аб'ехалі шмат цікавых месцаў Беларусі. Яшчэ амаль круглы год (апроч лета) займаюся ў спартыўнай зале, летам жа люблю плаваць.

Адносна нядаўна я захапілася фатаграфіяй. І гэта зразумела, бо вакол столькі прыгожага і так хочацца захаваць гэта надоўга! Доўгі час я марыла купіць прафесійны фотаапарат, але ўсё не атрымлівалася. Зараз жа, дзякуючы сучасным тэхналогіям, можна фатаграфаваць з дапамогай мабільнага тэлефона.

***– Вы вучыліся фатаграфаваць самастойна ці наведвалі нейкія курсы? Як злавіць той самы кадр і як для вас выглядае ідэальная фотасесія?***

– Фатаграфаваць вучуся пастаянна. Дзякуючы інтэрнэту, гэта рабіць нескладана. У сеціве можна знайсці карысныя парады, вебінары фотамайстроў, выконваць заданні, адпраўляць на суд прафесіяналаў свае нясмелыя спробы...

Галоўнае, як мне падаецца, – трэба інстынктыўна адчуваць кадр. Чалавечыя вочы істотна адрозніваюцца ад камеры, імі мы бачым у шмат разоў больш. Але ў тым і фокус, што трэба ўмець злавіць момант, які можна будзе любавацца зноў і зноў.

Як правіла, мы ўсе зацыклены на нейкіх звыклых ракурсах, імкнемся рабіць кадры, падобныя на нечыя... А гэта няправільна. Сучасная тэндэнцыя – пошук новых форм, эфектаў, ракурсаў, тэхнік. Гэта можна заўважыць у работах многіх сучасных прафесійных фатографаў.

Адна з запамінальных маіх фотасесій адбылася гэтым летам: я здымала з вышыні 1000 метраў падчас палёту на паветраным шары.

***– Нярэдка можна пачуць ад фатографаў, што самае цяжкае – гэта фатаграфаваць людзей, бо многія з іх саромеюцца камеры. Што б вы параілі?***

– З аднаго боку, можна падысці да гэтага пытання з усёй адказнасцю і чытаць адпаведную літаратуру. Напрыклад, магу параіць кнігу амерыканскага фатографа Раберта Валенсуэла «Ідэальнае пазіраванне». З другога, трэба ўмець адпускаць сітуацыю, дазваляць чалавеку быць самім сабою, імкнуцца зрабіць усе залежнае, каб ён



адчуваў сябе максімальна камфортна.

***– На вашу думку, ці можа хобі стаць працай?***

– Я юрыст па прафесіі і па прызванні. У маім выпадку хобі зусім не канкурэнт працы, бо менавіта мая выкладчыцкая дзейнасць займае большую частку часу. Калі будзе інакш, гэта стане падставай задумацца, ці не пара змяніць прафесію. Але, калі шчыра, не думаю, што такое магчыма.

---



***– Анастасія Андрэеўна, наколькі я ведаю, вы яшчэ ў студэнцкія гады пачалі займацца вырабам сувеніраў і ўпрыгожванняў з дрэва. Як вы прыйшлі да гэтага занятку?***

– Мне заўсёды падабалася рабіць упрыгожванні, для гэтага я спрабавала выкарыстоўваць розныя тэхнікі і матэрыялы. Гэта – бісер, сутаж, кераміка, палімерная гліна і іншыя.

Аднойчы я ўбачыла вакансію ў інтэрнэце – быў патрэбны спецыяліст па лазернай рэзцы па дрэве. Тады і вырашыла – чаму б і не. Дарэчы, на гэтай пасадзе я працавала нядоўга, затое зразумела, што менавіта гэта тэхніка і гэты матэрыял мне падабаюцца больш за ўсё.

***– Што вас найбольш прываблівае ў вашым хобі і ці цяжка гэтаму навучыцца?***

– Больш за ўсё я люблю сам працэс вырабу, ён мяне захапляе і супакойвае. Хаця лазерная рэзка па дрэве – адна з самых складаных і карпатлівых работ.

Практычна адразу, як я пачала займацца вырабам сувеніраў і ўпрыгожванняў, афарміла рамесніцтва. Зараз сумяшчаю сваё хобі з працай на факультэце. Працаваць з дрэвам для мяне – лепшы адпачынак.

Прафесійна гэтаму нідзе не навучалася, усё спрабавала рабіць сама.

***– Якія пароды дрэў вы часцей выкарыстоўваеце для вырабу ўпрыгожванняў і ці ёсць нейкія сакрэты іх эксплуатацыі?***

–Як правіла, я працую з бярозай або з яловымі пародамі драўніны. Амаль заўсёды раблю акцэнт на ручны роспіс, выкарыстоўваю фарбы і пакрываю вырабы воданепранікальнымі вадкасцямі, таму ніякі дождж ім не страшны. Але, як і любое дрэва, такія ўпрыгожванні і сувеніры баяцца працяглых кантактаў з вадой, таму не рэкамендуецца іх доўга мыць.

І, вядома, трэба памятаць, што гэта ручная праца, якая ў цэлым патрабуе акуратнасці падчас эксплуатацыі.

***– Цікава, як вы знаходзіце сваіх пакупнікоў?***

– Часцей за ўсё я рэкламую свае вырабы праз Instagram, з задавальненнем прымаю ўдзел у розных кірмашах, мерапрыемствах, дзе рамеснікі могуць паказаць сваю прадукцыю, знайсці кліентаў і пазнаёміцца з аднадумцамі.



***– Дайце, калі ласка, якія-небудзь парады тым, хто толькі пачынае спрабаваць сябе ў дадзенай сферы.***

– Трэба заўсёды памятаць пра сваю індывідуальнасць. Яшчэ зараз папулярна прасоўваць не столькі прадукт, колькі сябе як майстра, таму трэба не баяцца гэта рабіць.

**Эла МАРКЕВІЧ,**
**студэнтка 3 курса ФГІМК.**
**Фота з архіву рэспандэнтаў.**